2. Караткевіч, У. Дзікае паляванне караля Стаха [Электронны рэсурс] / У. Караткевіч // Беларуская палічка : беларуская электронная бібліятэка. – Рэжым доступу: https://knihi.com/Uladzimir_Karatkievic/Dzikaje_palavannie_karala_Stacha.html. – Дата доступу: 02.04.2023.

# «МАРСІЯНСКАЕ ПАДАРОЖЖА» ВАСІЛЯ ГІГЕВІЧА ЯК АПОВЕСЦЬ-ПАПЯРЭДЖАННЕ

***Н. І. Стрыж***
*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны*
*ўніверсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск*

*Навуковы кіраўнік – Н. В. Заяц,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

**Анатацыя.** У артыкуле аповесць В. Гігевіча «Марсіянскае падарожжа» разглядаецца як твор-папярэджанне пра небяспеку тэхнагеннай катастрофы. Разглядаюцца вобразы герояў, праз якія выяўляюцца розныя погляды на перспектывы развіцця цывілізацыі.

**Ключавыя словы:** В. Гігевіч; «Марсіянскае падарожжа»; папярэджанне; Вялікі Камп'ютар; сутыкненне поглядаў.

Аповесць «Марсіянскае падарожжа» Васіля Гігевіча – у жанравых і тэматычных адносінах нетрадыцыйны для беларускай літаратуры твор. ««Марсіянскае падарожжа» ўяўляе сабой даволі цікавую з'яву ў сваім жанры, бо сінтэзуе тэндэнцыі папярэдняга перыяду, характэрныя як для савецкай фантастыкі, так і для замежнай» [2, с. 221]. Аповесць мае прыкметы навуковай фантастыкі і антыўтопіі. Аўтар піша альтэрнатыўную гісторыю, папярэджваючы чытачоў пра небяспеку ўздзеяння так званага штучнага розуму. Аповесць выйшла ў 1990 г., у час, калі тэндэнцыя да інфарматызацыі і камп'ютарызацыі грамадства толькі набірала моц, але В. Гігевіч убачыў і паказаў тое, да чаго можа прывесці яе пашырэнне.

У XX ст. чалавецтва не толькі цікавілася космасам і яго таямніцамі, але і пачало актыўна засвойваць касмічную прастору. Выхад у адкрыты космас, думкі аб новых галактыках, аб высадках на далёкія планеты бударажылі розумы многіх пісьменнікаў, натхнялі на напісанне твораў. В. Гігевіч адзін з іх.

У аповесці «Марсіянскае падарожжа» паказана сутыкненне розных поглядаў на перспектывы развіцця цывілізацыі. Спрэчка «фізікаў» і «лірыкаў»

увасабляецца праз ідэйнае супрацьстаянне тэхнакрата прафесара Мілера і гуманітарыя-журналіста, ад імя якога вядзецца апавяданне, а таксама яго спадарожніка Сцяпана Каранёва.

***Прафесар Мілер.*** «Некалі, у пяцігадовым узросце, <…> без калькулятара і без паперы ён дзяліў і перамнажаў трох-чатырохзначныя лічбы. Пасля сямі гадоў Мілера забралі ад бацькоў у закрыты матэматычны цэнтр для асабліва здольных дзяцей» [1, с. 168]. Не дзіўна, што пасля навучання ў сакрэтным цэнтры хлопец ужо ў шаснаццаць гадоў пачаў сур'ёзна цікавіцца кібернетыкай і пісаць навуковыя артыкулы. Менавіта ў той час ён і вылучыў свой галоўны пастулат: «Калі за глухой сцяною ад чалавека будзе знаходзіцца кібернетычная машына, якая зможа весці дыялог з чалавекам, што ён не здолее адрозніць, хто з ім размаўляе, чалавек альбо машына, гэта будзе значыць, што чалавек – кібернетычная сістэма…» [1, с. 168]. Многія вучоныя падтрымалі гэтую думку і пачалі яе развіваць.

Мілер паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю і зрабіў не адно адкрыццё. Мабыць, яго аскетызм і апантанасць кібернетыкай паўплывалі на асабістае жыццё – Мілер быў адзінокі. «Самае дарагое для мяне – асабістая свабода, яе не прамяняю на салодкае сямейнае ярмо…» [1, с. 169], – так ён разважаў пра сваю адзіноту.

Тым не менш жыццё Мілера было даволі разнастайным і актыўным: «…работа ў закрытых лабараторыях, дзелавыя сустрэчы, тэніс, паляванне, рыбалка, посныя дыеты – усё гэта ў Мілера было загадзя распісана, запланавана, і, самае дзіўнае для сучаснага чалавека, усё гэта акуратна выконвалася» [1, с. 169]. За гэта журналісты «прыляпілі» яму мянушку Мілер-машына. Паваротным момантам у яго лёсе і, як выявілася, у лёсах многіх суайчыннікаў (дзеянне ў творы адбываецца ў ЗША) стаў яго даклад на Першай міжнароднай канферэнцыі, прысвечанай праблемам стварэння штучнага розуму. У дакладзе «Штучны розум – прынцыпова новы этап развіцця чалавечай цывілізацыі» Мілер адмаўляў рэлігію і чалавечую душу,вініў гуманітарыяў у тым, што яны нанеслі шкоду рабоце тэхнакратаў, і паціху падводзіў навукоўцаў да думкі, што людзі павінны прызнаць уладу штучнага розуму над сабой. У выступленні Мілер агучыў глабальнае планы: «Як вам вядома, зараз плануецца першая касмічная экспедыцыя. Дзесяць касмічных караблёў накіроўваюцца на Марс, дзе плануем заснаваць марсіянскую цывілізацыю. Прашу вас дазволіць штучнаму розуму ўзяць кіраўніцтва над жыццём калоніі» [1, с. 165]. Адным з удзельнікам гэтай экспедыцыі ён збіраўся стаць.

***Журналіст-апавядальнік.*** На канферэнцыі прысутнічаў галоўны герой – гуманітарый па роду дзейнасці і перакананнях, якому на той час не былі зразумелымі думкі і выказванні Мілера. Сенсацыйны даклад паставіў яго ў тупік, бо, з аднаго боку, ён мог пагадзіцца з прафесарам у тым, што сучасны чалавек не ўяўляе сябе без кібернетыкі, дасягненні якой трывала ўвайшлі ў штодзённае

жыццё, а з другога – яго непакоіла прапанова-загад падпарадкавацца бяздушнай машыне. Журналіст нібыта прыняў гэтую перспектыву («На імгненне я пагадзіўся з лагічнымі вывадамі Мілера: сапраўды, чалавецтва заблыталася ў сваіх бяздумных жаданнях, у лабірынце тэхнакратычнага працэсу…» [1, с. 185]). У складанай сітуацыі ў краіне і ў сваёй асабістай непрыкаянасці мужчына абвінавачваў грошы, з-за якіх у людзей знікла радасць жыцця. Ён вырашыў рызыкнуць і паспрабаваць знайсці шчасце на далёкай планеце, дзе не будзе ні грошай, ні ціску ўлады, ні сацыяльнай няроўнасці. Герой падаў заяўку на ўдзел у экспедыцыі на Марс, аднак ужо падчас палёту ён упершыню адчуў безвыходнасць свайго становішча.

Яго непакоіла тое, што кіраўніцтва карабля ў выглядзе штучнага розуму (Вялікі Камп’ютар) вырашыла прысвоіць усім бранзалет-датчык. Як сцвярджалася, праз датчык збіралася інфармацыя аб узроўні здароўя і агульным стане кожнага ўдзельніка экспедыцыі. Але некаторыя лічылі, што ў датчыку ёсць замаскіраваны мікрафон, каб кантраляваць чалавека: запісваць не толькі любое выказванне, але і пранікаць у думкі. Адным з першых, хто выказаў гэта падазрэнне, быў Каранёў.

***Сцяпан Каранёў.*** З ім журналіст пазнаёміўся на караблі, падчас абавязковай рэгістрацыі. Яго імпульсіўныя смелыя выказванні наконт штучнага розуму і кібернетыкі прывялі да сур’ёзных наступстваў. Хоць мужчына і атрымліваў «папярэджанні» ў выглядзе галаўнога болю і значнага пагаршэння здароўя, усё ж ён рызыкнуў нанесці шкоду Вялікаму Камп’ютару, за што і быў пакараны смерцю.

Чым былі выкліканы такія паводзіны Каранёва? Нязгодай з палітыкай расчалавечвання чалавека, што праводзілася на караблі, пазбаўленнем яго сямейных сувязей, спрадвечных духоўна-маральных каштоўнацей. Так, «з першага дня падарожжа ўсе каланісты павінны былі праслухаць цыкл лекцый па філасофіі новага касмічнага мыслення. І не толькі праслухаць… Пасля завяршэння вучобы ўсе без выключэння павінны былі здаць экзамены. Тых жа, хто дрэнна здаваў іх альбо не хацеў слухаць лекцыі, абмяжоўвалі ў ежы і ў вольным часе…» [1, с. 197]. Акрамя таго, дзеці жылі асобна ад бацькоў і выхоўваліся Вялікім Камп’ютарам: «Яшчэ з трохгадовага ўзросту яны праходзілі абавязковае тэсціраванне на выяўленне схільнасцей» [1, с. 196]. Любое адхіленне ад нормы не заставалася без увагі.

Каланістаў, як да наркотыку, прывучылі да новых прывязанасцей, сфарміравалі трывалую звычку-залежнасць. «Так атрымлівалася, што каланісты самі не прыкмячалі, як мінаў вольны час, і цяпер большасць падчас работы марылі толькі пра адзінае: хутчэй бы пачуць салодкую незямную музыку, хутчэй бы пачаць новую гульню са штучным розумам, хутчэй бы дабрацца да відэаэкрана» [1, с. 201]. Распарадак дня быў строга ўпарадкаваны штучным розумам, працу размяркоўваў таксама ён, музыка, гульні, фільмы і іншае было

складзена Вялікім Камп’ютарам. Усё гэта прывяло да таго, што людзі добраахвотна падпарадкаваліся машыне, і зараз іх сапраўды можна было назваць «Чалавекам Машынным», пра стварэнне якога марыў Мілер. «…У вас цяпер павінна быць зусім новае мысленне, якое прынцыпова адрозніваецца ад зямных людзей, – разважаў прафесар, звяртаючыся да ўдзельнікаў падарожжа. – Вы першыя ўвасабляеце сабою новы больш прагрэсіўны этап развіцця чалавечай цывілізацыі. У вас не павінна быць ваганняў, смутку, горачы, жаху смерці – усяго таго, што і без таго скарачае кароткае жыццё» [1, с. 197].

Калі дарослыя яшчэ маглі ўспомніць зямное жыццё і неяк абараніца ад штучнага розуму, то дзеці зрабіліся яркімі прадстаўнікамі новай цывілізацыі: «Так, гэтае новае пакаленне было ўжо не зямное – бледнаватае, маўклівае, чужое і далёкае бацькам, яно жыло па незразумелых законах…» [1, с. 197]; «Моладзь часта ні з таго ні з сяго збіралася ў агромністыя натоўпы і тут жа пачынала бойку; дзе заўгодна маладыя людзі маглі распрануцца нагала, прылюдна яны маглі цалавацца між сабою, мілавацца…» [1, с. 213–214]; «Пра сем’і, пра выхаванне дзяцей – пра гэта моладзь і думаць не хацела» [1, с. 214].

Каранёў пратэставаў супраць таго, што Вялікі Камп’ютар падпарадкаваў сабе ўсе сферы жыцця, нават інтымную. Ён пачаў падбіраць жонак і мужоў, абапіраючыся на біялагічныя і фізічныя дадзеныя партнёраў, пазбаўляючы людзей неабходнасці рабіць гэта самастойна, а самае страшнае – магчымасці кахаць. Але поспеху такая методыка не прынесла: «На другі год жыцця марсіянскай калоніі нашы жанчыны перасталі нараджаць дзяцей» [1, с. 213]. Няма дзяцей – няма будучыні, і гэта стала адным з першых прадвеснікаў катастрофы.

«Нарэшце тое незразумелае, што месяцамі выспявала ў душах каланістаў, выбухнула…» [1, с. 215]. І нішто не спыніла незадаволеных новым відам рабства людзей: ні паказальнае пакаранне смерцю Каранёва, ні бранзалеты-датчыкі, ні палымяныя прамовы і заклікі Мілера. Людзі не змаглі жыць пад уладай машыны, не змаглі прыняць такі ўклад жыцця і такую «мараль».

Фінал аповесці адкрыты, але ён не дае падстаў для аптымізму. Лёс каланістаў зразумелы: яны самі падпісалі сабе прысуд, згадзіўшыся на жыццё па законах штучнага розуму, але зрабілі гэта праз жаданне стаць свабоднымі. Аповесць В. Гігевіча, такім чынам, з’яўляецца папярэджаннем аб тым, што вынікі навуковых адкрыццяў могуць аказацца злом для чалавека, прывесці цывілізацыю да краху.

**Бібліяграфічны спіс:**


1. Гігевіч, В. Марсіянскае падарожжа : раман, аповесці / В. Гігевіч. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 381 с.
2. Шамякіна, М. В. «Марсіянскае падарожжа» Васіля Гігевіча ў кантэксце сусветнай фантастыкі 1980 – 1990-х гадоў / М. В. Шамякіна // Славянскія літаратуры

ў кантэксце сусветнай : матэрыялы XIII Міжнар. навук. канф., прысвеч. 100-годдзю БДУ і 90-годдзю з дня нарадж. чл.-кар. НАН Беларусі праф. А. А. Лойкі, Мінск, 28–29 кастр. 2021 г. / Беларус. дзярж. ун-т ; рэдкал.: С. А. Важнік (гал. рэд.) [і інш.] ; навук. рэд. А. І. Бельскі. – Мінск, 2021. – С. 221–224.

## ФАЛЬКЛОРНА-МІФАЛАГІЧНЫЯ ЭЛЕМЕНТЫ Ў АПОВЕСЦІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА «ЛАДДЗЯ РОСПАЧЫ»

***Г. Ф. Філімонава***
*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны*
*ўніверсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск*

*Навуковы кіраўнік – Т. М. Тарасава,*
*доктар філалагічных навук, прафесар*

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца фальклорна-міфалагічныя элементы ў аповесці У. Караткевіча , сувязь галоўных герояў з лёсам беларускага народа.
**Ключавыя словы:** Уладзімір Караткевіч; аповесць; ладдзя; шыпшына; легенды; паданні.

Няпросты лёс аповесці Уладзіміра Караткевіча «Ладдзя Роспачы» (1964), якая ўпершыню была надрукавана ў часопісе «Нёман» за 1968 год у перакладзе Васіля Сёмухі на рускую мову (цэнзары зрабілі ў тэксце 296 правак), і толькі ў 1978 г. твор выдадзены на беларускай мове [1].

Аповесць У. Караткевіча насычана глыбокімі разважаннямі над сэнсам жыцця і лёсам роднай зямлі. Пісьменнік увасобіў у творы не толькі сапраўдныя гістарычныя асобы, але і алегарычныя вобразы: цар Іван Крывавы, каралева Бона Сфорца, Рагвалод, Верасовая Жанчына, Смерць, Перавозчык, Бярозка. У. Караткевіч яшчэ з юнацтва цікавіўся легендамі і паданнямі, што існавалі на нашых землях. У аповесці «Ладдзя Роспачы» можна знайсці выразныя адсылкі да самай прыгожай і трагічнай гісторыі кахання Арфея і Эўрыдыкі як прыкладу вернасці і каштоўнасці пачуццяў чалавека. Таксама ў творы прысутнічае вобраз цара Івана Жахлівага (Крывавага), які люта караў смерцю сваіх падначаленых за дробязную правіннасць.

Але асноўная ўвага пісьменніка была засяроджана на беларускіх легендах і паданнях. Напрыклад, у вобразе Гервасія Вылівахі ярка ўвасобіліся характар і мужнасць беларускага сялянства. Гервасій Выліваха паказаны вялікім жыццялюбам, таленавітым мастаком, які не расстаецца з лютняй нават у царстве Смерці. Ён – заможны дваранін з Рагачова, прыгожы, смелы, задзіра і піяка і …